# ПРЫКМЕТЫ ВОСЕНІ

Канспект занятка  ў старэйшай групе па адукацыйнай вобласці «Развіцце мауле́ння і культура мауленчых зносін»

**Праграмныя задачы:** развіваць уменне правільна вымаўляць гукі “дж”, “дз”, “г”; развіваць уменне слухаць і разумець мову выхаваццеля, адказаць на пытанні, чытаць вершы, чыстагаворкі, прыказкі на беларускай мове, адгадваць загадкі; развіваць творчае ўяўленне, назіральнасць, мысленне, эмацыянальную выразнасць; замацоўваць і ўдакладняць слоўнік дзяцей на аснове ўжо атрыманых ведаў; увесці ў слоўнік дзяцей словы “одум”, “род”, “хустачка”, “прыгажэй”; выхоўваць станоўчыя адносіны да беларускай мовы, жаданне выкарыстоўваць  фальлорныя творы.

**Абсталяванне:** касцюм паштальена, беларускія касцюмы для дзяцей і выхаванцаў, магнітафон, аудыезапіс беларускай мелодыі, саламяная кветачка, пасылка, муляж рэдзькі, асеннія лісцікі, карцінкі дрэў і птушак, цудоўны мяшочак, садавіна і агародніна.

**Ход занятка:**
*Гучыць беларуская музыка. Заходзяць дзеці і выхавацель у нацыянальных касцюмах. Вітаюцца.*
- Добры дзень, …!

Выхавацель: - Узяў мяне одум:
Хто я такая, адкуль родам?
І дазнацца ў мамы мусіла –
Беларусачка я, з Беларусі!

А вы, дзеці, адкуль родам?

Ягорка: Я – беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя,
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.(*Паказвае на нацыянальны куток).*

- Вельмі добра расказаў верш Ягор. А мы усе разам паўторым верш, выдзяляючы голасам  па чарзе словы верша.

Волька: Твар румяненькі,
Белая хустачка.
Я ўжо ведаю, я – беларусачка!
І хачу так як тата і мама,
Родны край свой любіць я таксама.

- Дзяўчынкі паўтарыце выразна: «Я ўжо ведаю, я – беларусачка!»

Радзівон: Беларусам нарадзіўся,
Беларусам буду жыць,
Беларускую зямельку
Буду шчыра я любіць
Бо радзімая старонка
Над усё мне прыгажэй,
Беларуская гаворка
Над усё мне даражэй.

-Хлопчыкі паўтарыце: «Беларусам нарадзіўся, беларусам буду жыць»

Выхавацель: Дзякую Ягору, Волечцы, Радзівону за вершы, за правільнае вымаўленне гукаў беларускай мовы. Давайце правільна скажам па-беларуску: *гаворка, гэта, ганаруся, прыгажэй, даражэй, зямелька, Радзіма.* У вас добра атрымалася, я задаволена вашымі адказамі.
- Вельмі добра, дзеці, што вы любіце родны край, родную мову. І сення мы будзем найдалей вучыцца гаварыць на беларускай мове, бо кожны беларус павінен ведаць сваю мову, як сваё імя.

- Раз, два, тры, чатыры, пяць
Бавім час мы не дарма.
Прашу хуценька назваць
сваё ласкавае імя.

Гульня «Назаві ласкава»

Стук у дзеры. Пачтальён прыносіць пасылку: «Добры дзень. Я трапіў у групу «Яблынька»? Хто тут выхавацель, адкажыце дзеці? Таццяна Іванаўна, распішыцеся ў атрыманні пасылкі. Калі ласка. Да пабачэння!»

Каб даведацца ад каго пасылка, патрэбна здагадацца, калі гэта бывае:
- У верасні і ліст на дрэве не трымаецца.
- Халодны кастрычнік, але сыты.
- У лістападзе гола у садзе.
- Калі ж гэта бывае?
Вядома ж  восенню. Можна гаварыць **восенню,** альбо **увосень** (*калектыўны і асабістыя адказы)*
А ад каго пасылка?

**Песня “Залатая восень”**

Мы вучылі **прыказкі** пра восень. Хто раскажа?
Растлумач гэту прыказку.
Справілісь і пасылка адчынілась, і

Восень запрашае пагуляць у **рухомую гульню** «Рэдзька».
*Выхавацель ацэньвае прагаворванне слоў дзецьмі.*

Гульня «Збяры букет з асенніх лісткоў». Павінны сабраць букет і назваць з якіх дрэў лісткі у вашым букеце. Напрыклад, «У маім букеце асінавы, бярозавы, кляновы, каштанавы, альховы, рабінавы лісток». Пераможа той, хто назаве правільна найбольш лісткоў.

А што намалявана на гэтыэх карцінках? Называем хутка назвы дрэў (*выхавацель выстаўляе карцінкі на дошцы*).
А зараз гуляем у гульню **«Што знікла»**. *Выхавацель ацэньвае адказы поўным сказам.*
Дзеці, а дзе расце шмат дрэў? А хто яшчэ жыве ў лесе?
Прыдумайце **чыстагаворкі пра звяроў**.
*Са-са-са – хітрая ліса.*
*Шчоўк-шчоўк - блукае шэры воўк.*
*Ведзь- ведзь - у бярлозе спіць мядзведзь.*
*Жык-жык-жык - бяжыць хутка вожык.*
*Бр-бр-бр – пілуе дрэвы бобр.*
*Брысь-брысь-брысь – на дрэве рысь.*
*Бубр-бубр-бубр – рыкае зубр.*
*От-от-от – чысціць шубку енот.*
*Елка-елка-елка – грыбы збірае белка.*
*Лень-лень-лень – пасвіцца алень.*
*Вось-вось-вось - скідае рогі лось.*

Восень прыслала малюнкі птушак. Трэба загадку адгадаць і птушку усім паказаць. *Выхавацель паказвае карцінкі, на якіх намаляваны* ***птушкі*** *і чытае загадкі пра іх, а дзеці стаяць у крузе, трымаюць карцінкі.*

*Хапаткія ў мяне крылы,*
*Хвосцік востры, нібы вілы,*
*З гліны я гняздо ляплю*
*Мошак на ляту лаўлю. (Ластаўка)*

*У чырвоных ботах,*
*Ходзіць па балоце,*
*Захаваўшы лапкі,*
*Спрытна ловіць жабкі. (Бусел)*

*Да яліны, да сасны*
*Доктар прыляцеў лясны.*
*Палячыў сасну, яліну*
*І высокі бор пакінуў.*
*Паляцеў у той лясок,*

*Дзе бярозавы піў сок. (Дзяцел)*

**Цудоўны мяшочак** ад восені. Жадаючы падыходзіць, мацае і гаворыць пра тое, што ў мяшку. Напрыклад, «Я намацаў цвердую, доўгую моркву».

Вось і закончыліся падарункі Восені, а ў нас поўныя гумны, кладоўкі і амбары.
“Канец – справе вянец”, “Справе - гадзіна, а пацехе – час”.

**Карагод «Карагод мы танцуем разам»**

**Літаратура:**


1. Старжынская, Н.С. Беларуская мова ў дзіцячым садзе. – Мн.: НАРОДНАЯ АСВЕТА, 1995.
2. Старжынская, Н.С. Развіцце маўлення дашкольнікаў– Мн.: НАРОДНАЯ АСВЕТА, 1993.
3. Беларускія гульні ў дзіцячым садзе/ Склад. З.І.Ермакова, В.М.Шабека. – Мн..: НАРОДНАЯ АСВЕТА, 1985.
4. Пралыгіна, Н.В. Беларускамоўны дзень у старэйшай групе : планаванне і арганізацыя работы / Н.В.Пралыгіна. – Мазыр : Содействие, 2013